**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«13/17»**

# АСАБЛІВАСЦІ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ СЕЛЬСКІХ МОГІЛАК БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV – XVIII стст.[1]

***В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Артыкул прысвечаны асаблівасцям тэрытарыяльнага размеркавання сельскіх могілак Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. Картаграфаванне могільнікаў і аб'ектаў са знешнімі прыкметамі пахаванняў разглядаемага перыяду (каменныя надмагіллі, каменныя крыжы) дазволіла вызначыць лакалізацыю помнікаў адносна прыродных аб'ектаў, узаемнае размяшчэнне помнікаў, выявіць раёны іх максімальнай канцэнтрацыі. Паколькі наяўнасць могільніка прадугледжвае існаванне сінхроннага ім пасялення, маецца сувязь паміж нераўнамернай канцэнтрацыяй могільнікаў і нераўнамернай заселенасцю рэгіёна. Большая частка могільнікаў XIV – XVIII стст. размешчана на левым беразе Заходняй Дзвіны па рэках Дзісна (Глыбоцкі раён), Ушача (Полацкі, Ушацкі, Лепельскі раёны), Ула (Бешанковіцкі раён) і іх прытоках, а таксама на водападзеле Дзвіны і Бярэзіны (Дняпроўскай) (Докшыцкі раён). На правым беразе Дзвіны пахавальныя помнікі сканцэнтраваны пераважна на паўночным усходзе. Зоны максімальнай канцэнтрацыі могільнікаў адпавядаюць найбольш засвоеным і заселеным тэрыторыям.*

***Ключавыя словы:*** *Беларускае Падзвінне, пахавальныя помнікі XIV – XVIII стст., сельскія могільнікі.*

**Уводзіны.** Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. да канца XX ст. не былі прадметам мэтанакіраванага археалагічнага вывучэння. Іх даследаванне адбывалася эпізадычна і пераважна ў выніку выпадковага выяўлення. Шэраг звязаных з імі задач на сённяшні момант не атрымаў належнага вырашэння [1, с. 177]. Адной з іх з'яўляецца вызначэнне спецыфікі тэрытарыяльнага размеркавання могільнікаў і тлумачэнне асаблівасцей іх размяшчэння. Пры гэтым колькасць помнікаў, даследаваных археалагічна, можа быць павялічана за кошт аб'ектаў з характэрнымі маркёрамі – надмагільнымі каменнымі вымасткамі, абкладкамі, вялікімі валунамі ў галавах/нагах пахавання, каменнымі крыжамі. Названыя каменныя канструкцыі выступаюць у якасці знешніх прыкмет пахаванняў даследуемага перыяду [2, с. 126, 136].

**Асноўная частка.** Картаграфаванне археалагічных помнікаў дазволіла нам вызначыць лакалізацыю помнікаў адносна прыродных аб'ектаў, узаемнае размяшчэнне помнікаў, выявіць раёны іх максімальнай канцэнтрацыі (малюнак 1) [3]. Помнікі размешчаны нераўнамерна. Большая частка могільнікаў лакалізавана на левым беразе Заходняй Дзвіны ўздоўж рэк Дзісна (Глыбоцкі раён), Ушача (Полацкі, Ушацкі, Лепельскі раёны), Ула (Бешанковіцкі раён) і іх прытокаў, а таксама на водападзеле Дзвіны і Бярэзіны (Докшыцкі раён). На правым беразе Дзвіны помнікі сустракаюцца пераважна на паўночным усходзе і ўсходзе [1, с. 178; 3, с. 18–19, мал. 2].

Нераўнамернае размяшчэнне пахавальных помнікаў XIV – XVIII стст. адпавядае нераўнамернай заселенасці Беларускага Падзвіння, якое тлумачыцца прыродна-геаграфічнымі фактарамі. Наяўнасць пахавальных помнікаў сведчыць пра існаванне побач з імі сінхронных пасяленняў, насельніцтва якіх і пакінула могільнікі. Зоны максімальнай канцэнтрацыі могільнікаў адпавядаюць найлепш засвоеным і найбольш заселеным тэрыторыям. Такі падыход у дачыненні да старажытнарускіх курганоў Полацкай зямлі ўпершыню ўжыў Л. В. Аляксееў [4, с. 9]. Даследчык адзначыў нераўнамернасць у размяшчэнні курганных груп, вызначыў іх скапленні і зоны адзінкавай прысутнасці, што адлюстроўвала заселенасць тэрыторыі [5, с. 24, мал. 1; 6, с. 12]. Таму наяўнасць на карце зон з высокай шчыльнасцю могільнікаў і «белых плям», дзе яны не выяўлены, тлумачыцца неаднароднай заселенасцю і гаспадарчай засвоенасцю рэгіёна ў пазначаны перыяд.

Нераўнамернае засваенне рэгіёна, наяўнасць у ім «скапленняў» (Л. В. Аляксееў), «згусткаў помнікаў» (В. М. Ляўко), «пасяленчых гнёздаў» (М. В. Клімаў) неаднаразова адзначалася даследчыкамі [5, с. 24; 6, с. 12; 7, с. 128–129]. Нераўнамернае размеркаванне помнікаў звязана з прыродна-ландшафтнай спецыфікай Беларускага Падзвіння. Большасць пахаванняў з каменнымі надмагіллямі лакалізуецца на поўдзень ад Заходняй Дзвіны. Гэта ўказвае на лепшую заселенасць левабярэжжа Дзвіны ў XIV – XVIII стст. Падобная сітуацыя назіраецца і з размяшчэннем курганных груп старажытнарускага перыяду. Буйнейшае на Падзвінні скапленне курганных пахаванняў, вылучанае Л. В. Аляксеевым, размяшчалася

[1] Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма 12.1. «Гісторыя і культура», заданне 1.1.01. «Беларускія землі ў першабытную эпоху, сярэдневякоўе і ранні Новы час: археалагічныя помнікі, тэрыторыя, насельніцтва, эканоміка і культура», навукова-даследчая работа «Насельніцтва Полацкага Падзвіння ў I–II тыс. н.э.»).

на поўдзень ад Полацка уздоўж ракі Ушачы і на ўсход ад яе да ракі Улы [5, с. 24; 8, с. 71]. Яно суадносіцца з зонай значнай канцэнтрацыі могільнікаў XIV – XVIII стст., якія маркіруюць тэрыторыю, аптымальную да гаспадарчай дзейнасці.



**Малюнак 1. – Карта пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст.**
Складзена паводле: [3].

На поўнач ад Заходняй Дзвіны пашыраны дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы [9, с. 100–101, 120], менш прыдатныя для сельскагаспадарчай дзейнасці. Прастора паміж Полацкам і Віцебскам занята лясамі і выцягнутымі ў мерыдыянальным напрамку балотамі [6, с. 12; 9, с. 120]. Невысокая ўрадлівасць глеб абмяжоўвала колькасць людзей, якія маглі пракарміцца за кошт апрацаванай зямлі [7, с. 132–133]. Не выпадкова асноўная частка шляхецкіх маёнткаў у Полацкім ваяводстве ляжала на поўдзень ад Дзвіны. На поўнач ад яе знаходзіліся слабазаселеныя дзяржаўныя і магнацкія ўладанні [10, с. 448]. Тэрыторыі на поўнач і поўдзень ад Дзвіны выразна адрозніваліся па колькасці населеных пунктаў і шчыльнасці іх размяшчэння, што добра бачна на карце М. Ф. Спірыдонава «Беларусь у канцы XVI ст.» (малюнак 2) [11].

Малалікасць пахавальных помнікаў XIV – XVIII стст. на поўнач ад Заходняй Дзвіны трэба звязваць са спецыфікай засваення гэтай тэрыторыі. Працэс развіцця вясковых паселішчаў у ваколіцах Полацка ў X – XVI стст. дэталёва вывучаны М. В. Клімавым [12, с. 3]. Даследчык прыйшоў да высновы аб наяўнасці ў рэгіёне значнай долі невялікіх маладворных пасяленняў [7, с. 132–133]. Акрамя таго, для Беларускага Падзвіння ўвогуле ўласціва дробнаконтурнасць сельскагаспадарчых угоддзяў [13, с. 269]. У X – XIII стст. асноўная колькасць вясковых пасяленняў размяшчалася па берагах невялікіх рэк і асабліва азёр. Унутраная каланізацыя ў ваколіцах Полацка актывізавалася ў XV – XVI стст. У XIV – XVI стст. значную долю паселішчаў у акрузе Полацка складалі пасяленні ў 1–3 двары. Частка іх размяшчалася на пусташах і купленых землях, частка – на землях, якія расчышчаліся ад векавых лясоў і выкарыстоўваліся для ляднага земляробства. Феадалы запрашалі на гэтыя землі свабодных сялян, на некалькі гадоў вызваляючы іх ад падаткаў ці робячы іх памер меншым. Часовы характар ільгот і прымацаванне «пахожых» сялян да зямлі ў выпадку іх працяглага пражывання ва ўладаннях аднаго феадала (50 гадоў да выдання І Статута ВКЛ) вызначаў часовы характар такіх маладворных пасяленняў. Не жадаючы пагаршэння ўласнага сацыяльнага статусу, сяляне праз нейкі час пакідалі абжытыя землі, што прыводзіла да знікнення пасяленняў [7, с. 131–132; 12, с. 9–10; 14, с. 93].




**Малюнак 2. – Карта Беларусі ў канцы XVI ст., складзеная М.Ф. Спірыдонавым (фрагмент)**
Паводле: [11].

Маладворныя пасяленні амаль не пакінулі слядоў, таму з цяжкасцю падлягаюць выяўленню і фіксацыі [7, с. 132; 15, с. 330]. Пасяленням з невялікай колькасцю жыхароў павінны былі адпавядаць такія ж невялікія могільнікі, якія маглі не захавацца да нашага часу. Да таго ж большасць вядомых сельскіх могілак зафіксавана дзякуючы каменным надмагіллям. На Беларускім Падзвінні вядомы і сельскі могільнік XIV – XVIII стст. без каменных надмагілляў (Лучна I) [1, с. 180]. Па прычыне адсутнасці візуальных прыкмет выявіць такія помнікі значна цяжэй. Не выключана, што насельніцтва правага берага Заходняй Дзвіны практыкавала пахаванні без каменных канструкцый. Прыроднай умовай для вырабу каменных надмагілляў з'яўляецца наяўнасць валуноў. Глебы Беларускага Падзвіння ў значнай ступені завалунены [13, с. 89, 94–95, 97, 102; 16, с. 10], але гэты паказчык у межах рэгіёна істотна вагаецца. Тэрыторыя на поўнач ад Дзвіны, каля Полацка, завалунена значна менш, чым тэрыторыя каля Віцебска і левабярэжжа Дзвіны, што можа быць адной з прычын малалікасці там вядомых нам могільнікаў XIV – XVIII стст.

**Высновы.** Такім чынам, праведзенае намі картаграфаванне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. і аб'ектаў з каменнымі надмагіллямі і крыжамі выявіла нераўнамернасць іх размяшчэння. Большая частка сельскіх могільнікаў знаходзіцца на левым, паўднёвым, беразе Заходняй Дзвіны і лакалізуецца ў Глыбоцкім, Полацкім, Ушацкім, Лепельскім раёнах, а таксама на водападзеле Дзвіны і Бярэзіны Дняпроўскай (Докшыцкі раён). На правым беразе Дзвіны помнікі сустракаюцца пераважна ў Гарадоцкім раёне. Паколькі могільнікам адпавядаюць сінхронныя ім пасяленчыя помнікі, нераўнамернасць размяшчэння пахавальных помнікаў адлюстроўвае нераўнамерную заселенасць Беларускага Падзвіння. Скапленні пахавальных помнікаў абазначаюць найбольш заселеныя мікрарэгіёны. Гэта тлумачыцца прыродна-геаграфічнымі ўмовамі рэгіёна. Тэрыторыі па правым беразе Дзвіны ў большай ступені забалочаны і былі менш прыдатнымі для сельскагаспадарчай дзейнасці.

## ЛІТАРАТУРА

1. Климов, М. В. Погребальные памятники полоцкой округи XIII–XVIII вв. / М. В. Климов, В. В. Черевко // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке /

О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – С. 176–182.
2. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с. ; іл.
3. Чараўко, В. У. Матэрыялы да карты пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стагоддзяў / В. У. Чараўко // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2010. – № 7. – С. 14–20.
4. Риер, Я. Г. Сельское общество Могилёвского Поднепровья X–XIII вв. по археологическим данным / Я. Г. Риер. – Могилёв : МГУ им. А. А. Кулешова, 2010. – 176 с. ; ил.
5. Алексеев, Л. В. Некоторые вопросы заселённости и развитие западнорусских земель в IX–XIII вв. / Л. В. Алексеев // Древняя Русь и славяне. – М. : Наука, 1978. – С. 23–30.
6. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие / О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2004. – 280 с. ; ил.
7. Клімаў, М. В. Асаблівасці рассялення ў акрузе Полацка: X – сярэдзіна XVI ст. / М. В. Клімаў // Гіст.-археал. зб. – Мінск, 2006. – № 21. – С. 128–134.
8. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. (Очерки истории Северной Белоруссии) / Л. В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 295 с. ; ил.
9. Нацыянальны атлас Беларусі. – Мінск : Белкартаграфія, 2002. – 292 с. ; іл.
10. Насевіч, В. Полацкае ваяводства / В. Насевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. У 2 т. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – С. 446–448.
11. Спиридонов, М. Ф. Беларусь в конце XVI в. Минск, 1992. – [1 л.]. Карта – приложение к книге: Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси XV–XVI вв. / М. Ф. Спиридонов. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.
12. Клімаў, М. В. Вясковыя паселішчы ў акрузе Полацка X – сярэдзіны XVI ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.06 / М. В. Клімаў ; ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2005. – 20 с.
13. География Белоруссии / под ред. В. А. Дементьева [и др.]. – изд. 2-е, перераб. – Минск : Вышэйшая школа, 1977. – 320 с. ; ил.
14. Климов, М. В. Сельская округа Полоцка в XI–XIII вв. / М. В. Климов // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – С. 88–96.
15. Климов, М. В. Округа Полоцка XIV–XVIII вв. по письменным и археологическим данным: местечки, сельские поселения / М. В. Климов // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – С. 325–336.
16. Смоліч, А. Геаграфія Беларусі / А. Смоліч. – 4-е выд. – Мінск : Беларусь, 1993. – 382 с. ; іл.

*Паступіў 27.05.2019*

## RURAL CEMETERIES PLACEMENT PARTICULARITY IN THE BELARUSIAN DVINA REGION OF THE 14th–18th CENTURIES

***V. CHARAUKO***

*The article is devoted to the rural cemeteries placement particularity in the Belarusian Dvina region of the 14th–18th centuries. The mapping of burial grounds and objects with external signs of burials of this period (stone gravestones, stone crosses) made it possible to determine the monuments localization relative to natural objects, the mutual placement of monuments, to identify maximum concentration areas of them. Since the presence of a cemetery presupposes the existence of a synchronous settlement, there is a link between the burial grounds uneven concentration and the uneven population of the region. Most of the 14th–18th centuries burial grounds located on the left bank of the Zapadnaya Dvina along the rivers Disna (Glubokoe District), Ushacha (Polotsk, Ushachi and Lepel Districts), Ulla (Beshenkovichi District) and their tributaries, as well as on the Dvina and Berezina (Dnieper) watershed (Dokshitsy District). On the right Dvina bank funerary monuments are concentrated in the northeast mainly. The burial grounds maximum concentration zones correspond to the most developed and inhabited territories.*

***Keywords:*** *Belarusian Dvina region, funerary monuments of the 14th–18th centuries, rural cemeteries.*